ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
14
СТУДЗЕНЯ
№ 2(1560)

Газета выдаецца з 1922 года.

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

СПАРТАКІЯДА «ЗДАРОЎЕ»

заўсёды збірае вялікую колькасць удзельнікаў і гледачоў. Чаму? Таму што спаборнічаюць тут не студэнты, а супрацоўнікі і выкладчыкі — людзі самых розных узростаў, якія любяць спорт. Адкрылі спартакіяду спаборніцтвы па валейболу. У іх прымалі ўдзел дзевяць мужчынскіх і шэсць жаночых каманд. У мужчын лепш выступаюць зборныя ФПМ і фізфака. А ў жанчын больш падрыхтаваныя каманды фізфака і ВЦ.

М. КУЧЫНСКІ.

ВОСТРАЙ І НАПРУЖАНАЙ

была барацьба паміж факультэтамі на першынстве БДУ імя У. І. Леніна па шахматах. Тут патрэбна было праявіць сапраўдны характар, вытрымку, здольнасць да аналізу сітуацыі, дапытлівасць. Усе гэтыя якасці і дапамаглі шахматыстам фізфака выйсці на першае месца. Другое і трэцяе адпаведна занялі каманды факультэта радыёфізікі і электронікі і ФПМ.

Ч. ВІКТАРАЎ.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Навагодні карнавал

ЦЭЛЫ ГОД чакалі яны гэта свята. І вось, нарэшце, яно прыйшло. Дарма, што на дварэ было не па-студзеньску цёпла, затое тут, у зале геаграфічнага корпуса БДУ, сапраўдны Новы год. Зіхаціць, пераліваецца рознакаляровымі цацкамі прыгажуня-ёлка. Вось-вось пачнецца карнавал. Усе, малыя і дарослыя, з нецярпеннем чакаюць самых жаданых гасцей — Дзеда Мароза і Снягурачку. Толькі што гэта? Замест іх з'яўляюцца Шэры Воўк і знаёмая ўсім шкодніца Шапакляк. І, напэўна, у многіх сапсаваўся б настрой, калі б не вясёлы Скамарох і любімы Карлсан. Толькі ўсё гэта не тое.

«Дзед Маро-о-оз! Сня-гу-рач-ка!»—пачалі гукаць дзеці. Дружней, яшчэ дружней. І Дзед Мароз і Снягурачка пачулі іх кліч і завіталі на ёлку. Тут і пачалося сапраўднае свята. Здавалася, вяселлю, гумару, жартам не будзе канца.

А з якім натхненнем танцавалі ўсе вакол навагодняй прыгажуні са Снягурачкай, Дзедам Марозам і Карлсанам, а таксама з Ваўком і Шапакляк, якія паабяцалі рабятам заўсёды быць добрымі і прыкладнымі. Потым дзеці чыталі вершы. Жадаючых было столькі, што ў Дзеда Мароза і Снягурачкі мех хутка апусцеў. Прыйшлося клікаць на дапамогу Ваўка і Бабулю Шапакляк. І яны на гэты раз не скупіліся. Чаго толькі не было ў іх мяшку: лялькі, тыгры, алавяныя салдацікі, машынкі, мячыкі, карзінкі з цукеркамі!.. Выбірай, што спадабалася, хопіць усім.

Хто ж падарыў дзецям такое цудоўнае свята? Арганізатары навагодняга карнавалу — студэнцкі клуб універсітэта. А самы актыўны ўдзел у яго падрыхтоўцы і правядзенні прынялі І. Апалайко — інструктар дзіцячага сектара студэнцкага клуба, Н. Янушкевіч — супрацоўніца кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, І. Калянкоў — супрацоўнік факультэта радыёфізікі і электронікі, У. Максімкоў — выпускнік гэтага ж факультэта, Л. Блізнюк — студэнтка V курса мехмата і іншыя.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

— Выдатна! — Жанна ўсміхнулася, але адразу адчула сябе крышачку няёмка перад аднакурснікамі, якія яшчэ не здалі экаміэкаміі сацыялізму студэнты чацвёртага сэрца:

— Есць пяцёрка!

Пра тое, як здавалі экзамен па палітлі. Але шчасце, шчасце зноў запаланіла курса ФПМ, глядзіце рэпартаж на другой старонцы.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

«Мы не заўсёды ведаем, чаго хочуць студэнты»

Такая фраза прагучала на пасяджэнні бюро партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, на якім абмяркоўваліся пытанні арганізацыі быту і адпачынку выкладчыкаў і студэнтаў. У гэтых словах канстатацыя факта: адпачынак студэнтаў у большасці выпадкаў праводзіцца па ўсталяваных стандартах, дзе на першым месцы стаіць масавасць.

ТАК, дзесяцігоддзямі многія гналіся за прывіднымі працэнтамі ахопу, рапартавалі аб колькасці праведзеных мерапрыемстваў. Ад іх патыхала і патыхае фармалізмам, да якога прывучалі і, на жаль, прывучаюць сёння юныя студэнцкія душы. Пагоня за лічбай, валам — разбэшчвае. І спрачацца цяпер з гэтым сцвярджэннем недарэчна, як і прытрымлівацца яго. Прыйшоў іншы час, са сваімі патрабаваннямі, крытэрыямі, ацэнкамі. Але па-ранейшаму, дакладваючы аб працэсе выхавання, нярэдка пералічваюць культурна-масавыя, спартыўна-масавыя і іншыя мерапрыемствы. Безумоўна, патрэбны і яны. Фестывалі і спартакіяды, напрыклад, пасвячэнні ў студэнты або розныя тэматычныя вечары. У іх зараджаюцца і мацнеюць пачуццё калектывізму, агульнай адказнасці, дух саперніцтва.

Але ці толькі яны патрэбны нашаму грамадству сёння, у час перабудовы? З трыбуны XXVII з'езда КПСС прагучала патрабаванне ўмела спалучаць масавую работу з індывідуальнай, улічваць інтарэсы і запатрабаванні кожнага чалавека, патрабаванне выхоўваць асобу, а тым больш спецыяліста, заўтрашняга кіраўніка. Могуць запярэчыць, маўляў, на пасяджэнні бюро парткома разглядалася пытанне адпачынку, а не выхавання моладзі. А хто сказаў, што выхаваннем трэба займацца толькі ў вучэбных аўдыторыях? Не, вольны час, паводле слоў К. Маркса, грамадскі здабытак і праводзіць яго трэба з карысцю для сябе і грамадства.

На парадку дня бюро парткома, як ужо гаварылася, было абмеркаванне быту і адпачынку. З інфармацыяй выступілі старшыня прафкома выкладчыкаў В. М. Анішчык і намеснік старшыні прафкома студэнтаў Г. У. Пацёкін. Шчыра кажучы, такое спалучэнне пытанняў наўрад ці апраўдана, хоць і стала традыцыйным. У кожным з іх свае праблемы, якія патрабуюць сваіх вырашэнняў. А ці могуць іх усе вырашыць адны прафсаюзныя камітэты?

Напрыклад, быт студэнтаў. На сённяшні дзень склаўся востры дэфіцыт інтэрнатаў. Яны перанаселены, каля 700 чалавек жывуць на прыватных кватэрах, ёсць цяжкасці з размяшчэннем маладых сем'яў. У той жа час нямала пакояў занята пад склады. Акрамя таго, ёсць праблемы з забеспячэннем сантэхнікай, у арганізацыі грамадскага харчавання, не хапае пунктаў бытавога абслугоўвання, у прыватнасці, у інтэрнаце № 3, мэблі і гэтак далей. Думаецца, на пасяджэнні бюро была б карыснай прысутнасць не толькі кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, але і прадстаўнікоў адміністрацыі універсітэта, якія адказваюць за гэтыя пытанні. Тады можна было б павесці больш канкрэтную размову і дабіцца больш аператыўнай ліквідацыі тых або іншых хібаў.

Тое ж самае датычыцца і праблемы адпачынку. Дастаткова сказаць, што арганізаваць яго часам проста няма дзе. У ніводным з васьмі інтэрнатаў згодна з праектам не прадугледжаны памяшканні для адпачынку і заняткаў спортам. На гэта ўказана ў пастанове ЦК Кампартыі Беларусі «Аб нездавальняючым стане спраў з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна», дзе падкрэсліваецца: «Сур'ёзна адстае матэрыяльная база грамадскага харчавання, фізкультуры і спорту». Значыць, неабходна прымаць кардынальныя меры для паляпшэння спраў і патрабаваць у першую чаргу з тых, хто павінен займацца імі па абавязку.

Чаго варта, напрыклад, нараканне члена бюро парткома, дэкана па падрыхтоўцы іншаземных студэнтаў Л. М. Аўсянкі на тое, што на пасяджэнне не запрошаны прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы і начальнік студэнцкага гарадка? Як кажуць, пастфактум. Пра гэта трэба было падумаць раней, калі рыхтавалася пытанне на бюро. Тым больш, што пры абмеркаванні ўсплылі «заезджаныя» праблемы аб недахваце вады і непрацуючым ліфце ў 13-павярховым інтэрнаце. Прыватнасці? Гэта з якога боку на іх паглядзець. І калі яны не вырашаюцца гадамі, то безадказнасць адказных асоб набывае непрыемную афарму В. А. Прокашава папракнула студэнтаў, што іх прафсаюзная і камсамольская арганізацыі ў пытаннях адпачынку і спорту працуюць кожная па сваіх планах, што ў іх няма ўзгодненасці. І тут можна дадаць: калі б быў на пасяджэнні бюро сакратар камітэта камсамола універсітэта, з абодвух важакоў моладзі можна было б і запатрабаваць за той фармалізм, аб якім мы ўжо вялі размову. Відаць, уся бяда ў тым, што кіраўнікі прафсаюза і камсамола робяць справаздачы паасобку, у розных інстанцыях.

Аб адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў можна было б пагаварыць больш падрабязна. На жаль, у інфармацыі на бюро парткома прафсаюз выкладчыкаў рабіў справаздачу, у асноўным, толькі за мінулы летні перыяд. Арганізацыя ж адпачынку ў час навучальнага года засталася ў ценю, не было ніякіх прапаноў па яго паляпшэнню. Думаецца, тут і трэба было б пагаварыць аб удзеле выкладчыкаў у арганізацыі вольнага часу студэнтаў, аб больш эфектыўнай дапамозе прафсаюзнага актыву ў гэтай справе.

Гэта, відаць, і меў на ўвазе намеснік сакратара парткома А. М. Рухля, калі на пасяджэнні сказаў:

— Мы не заўсёды ведаем, чаго хочуць студэнты. Не ўсе ідуць на сустрэчы і гутаркі, якія мы арганізуем. Напэўна, сацыялагічнай лабараторыі універсітэта трэба правесці даследаванні патрэб моладзі.

Член бюро парткома, дэкан фізічнага факультэта В. А. Гайсёнак сказаў:

— Па-мойму, час масавых мерапрыемстваў мінуў. Сёння моладзь імкнецца праводзіць свой адпачынак у больш вузкім коле: у клубах па інтарэсах, дыскатэках, у якіх-небудзь самадзейных аб'яднаннях. Значыць, трэба перабудоўвацца і нам.

Прыемна, што гэтыя прапановы прагучалі на пасяджэнні бюро. У іх занепакоенасць за тое, што робіць студэнт па-за сценамі аўдыторый. Цяпер важна як мага хутчэй перайсці да канкрэтных спраў, удзельнічаць у якіх павінны і партыйныя, і камсамольскія, і прафсаюзныя арганізацыі, і студэнцкія саветы, органы самакіравання. І не паасобку, а ўсе разам, як кажуць, у адзінай запрэжцы.

А. БІЛАН.

«Вячэрні Мінск».

З ВОПЫТАМ І ЗА ВОПЫТАМ

КАЛЕКТЫЎ факультэта радыёфізікі і электронікі, кіруючыся Пастановай ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне», актыўна ўключыўся ў працэс падрыхтоўкі спецыялістаў — радыёфізікаў новага зместу. Увесь гэты працэс падзяляецца на тры ўзаемазвязаныя цыклы. Важнейшая задача першага, агульнаадукацыйнага цыкла — даць студэнтам глыбокія веды па фундаментальных дысцыплінах: вышэйшай матэматыцы, агульнай і тэарэтычнай фізіцы, грамадскіх навуках. Асаблівасцю першага цыкла з'яўляецца ўключэнне ў яго бесперапыннай камп'ютэрнай падрыхтоўкі. Мэта яго — такое засваенне студэнтамі фундаментальных дысцыплін, якое развівае ў іх актыўнае, творчае мысленне. Прынамсі, надаецца вялікая ўвага прыкладному, практычнаму боку. Студэнту даецца таксама марксісцка-ленінскае разуменне важнейшых этапаў гісторыі развіцця фізікі, яе філасофскіх і метадалагічных праблем. У гэтых адносінах трэба адзначыць выдатных лектараў-фізікаў дацэнтаў В. М. Ткачэнка, В. І. Кузьміча, Г. І. Папко.

Наступны цыкл уключае групу вялікіх агульных радыёфізічных курсаў з выдатнай лабараторнай базай. Мэта яго — пашырэнне адукацыі і агульнай спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў-радыёфізікаў.

ДАСЯГНУЦЬ НОВАГА ЎЗРОЎНЮ

Нарэшце, трэці, апошні цыкл накіраваны на навучанне канкрэтнай справе, больш вузкай спецыялізацыі, на далучэнне студэнтаў да самастойнай творчай ці вытворчай дзейнасці.

Асабліва многа робіцца і зроблена на нашым факультэце па арганізацыі навучання на працягу трэцяга цыкла. Для гэтага дэканат, савет і партыйная арганізацыя факультэта ў адпаведнасці з дырэктыўнымі дакументамі правялі вялікую работу па арганізацыі мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў для прадпрыемстваў рэспублікі. У выніку былі заключаны доўгатэрміновыя дагаворы з рознымі міністэрствамі, у тым ліку з Міністэрствам прамысловых сродкаў сувязі (ВА «Спадарожнік» — 5 чалавек, ВА вылічальнай тэхнікі — 12). Падрыхтаваны і ў бліжэйшы час будзе зацверджаны дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы з Міністэрствам радыёпрамысловасці (ВА «Гарызонт» — 25, НВА «Гранат» — 30 чалавек). У адпаведнасці з гэтымі дакументамі на ВА «Інтэграл» і НВА «Гранат» арганізаваны філіялы кафедраў фізічнай электронікі і кібернетыкі. У іх функцыі ўваходзіць арганізацыя стажыроўкі маладых спецыялістаў, узгадненне тэм курсавых і дыпломных работ у адпаведнасці з патрабаваннямі вытворчасці, арганізацыя і правядзенне вучэбных заняткаў у спецлабараторыях на вытворчай базе ВА «Інтэграл» для старшакурснікаў. Пачынаючы з другога курса студэнты факультэта маюць магчымасць займацца вытворчай дзейнасцю на ВА «Інтэграл» на пасадах тэхнікаў, наладчыкаў і інжынераў у саставе вытворчага атрада «Імпульс». Тут яны працуюць 8—12 гадзін у тыдзень у другой палове дня.

Гаворачы пра мэтавую падрыхтоўку, мы маем на ўвазе не толькі прамыя сувязі «факультэт — вытворчасць», але і «факультэт — НДІ». Нягледзячы на адсутнасць юрыдычнага вопыту ў заключэнні дагавораў з НДІ, мы вядзём падрыхтоўку спецыялістаў у цеснай кааперацыі з НДІ ПФП, НДІ ЯП, Інстытутам электронікі АН БССР і з некаторымі галіновымі інстытутамі. Падрыхтоўка спецыялістаў працягваецца ў лабараторыях пералічаных устаноў, дзе студэнты, пачынаючы з трэцяга курса, праводзяць адну трэць вучэбнага часу, выконваючы курсавыя і дыпломныя работы, авалодваючы навейшымі дасягненнямі ў галіне радыёфізікі. Так, напрыклад, студэнты кафедраў радыёфізікі і аўтаматызацыі навуковых даследаванняў па вызначанаму раскладу працуюць у НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі і ў НДІ ядзерных праблем, карыстаючыся самым сучасным абсталяваннем і вылічальнай тэхнікай.

Прынятыя партыяй і ўрадам дакументы дазволілі не толькі рэальна ажыццявіць сувязь факультэта з вытворчасцю, але і далі шырокія магчымасці савету перабудоўваць вучэбны працэс з улікам патрабаванняў часу. Так, на факультэце скарочаны лекцыйны матэрыял па агульных радыёфізічных дысцыплінах за кошт павелічэння часу, што адводзіцца студэнту на самастойную работу, якая арганізуецца з выкарыстаннем сродкаў вылічальнай тэхнікі і мікрапрацэсарных сістэм. Вялікі энтузіязм і працавітасць пры арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў праявілі асістэнты кафедраў кібернетыкі і аўтаматызацыі навуковых даследаванняў І. А. Шалатонін і А. Я. Пятраеў.

Зразумела, што на факультэце рэалізавана толькі частка мерапрыемстваў, прадугледжаных Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. Аднак партыйная арганізацыя, дэканат і савет факультэта зробяць усё неабходнае, каб накіраваць узросшую грамадскую актыўнасць выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў на дасягненне якасна новага ўзроўню ў падрыхтоўцы спецыялістаў.

А. ШЫРОКАЎ,
дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі.



НА ЗДЫМКАХ:

* Уважлівыя вочы выкладчыка прыкаваны да студэнта.

* Можна зайсці?

* Як мала хвілін адводзіцца на падрыхтоўку!

* Толькі б не перашкодзіла хваляванне...

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

АБ ХЛЕБЕ НАДЗЁННЫМ

НЕ ЗАЧАРСЦВЕЛА Б СЭРЦА

КОЖНЫ З НАС ПРЫВЫК УЖО ДА ТАГО, ШТО НА НАШЫМ СТАЛЕ ПАСТАЯННА ЁСЦЬ ХЛЕБ. БЕЗ ЯГО НЕ МОЖА АБЫХОДЗІЦЦА НІ СНЯДАНАК, НІ САМЫ СМАЧНЫ АБЕД, НІ ВЯЧЭРА. НЕ МОЖА АБЫСЦІСЯ БЕЗ ХЛЕБА І СВЯТОЧНЫ СТОЛ. ХЛЕБАМ І СОЛЛЮ СУСТРАКАЕМ МЫ САМЫХ ДАРАГІХ ГАСЦЕЙ. ЯГО КОЖНЫ РАЗ БЯРОМ З САБОЮ Ў ДАРОГУ.

МНОГІЯ ВЕДАЮЦЬ, як нялёгка ён даецца, колькі патрэбна прыкласці сілы, клопатаў, старання, каб вырасціць яго. Асабліва ведаюць цану хлеба людзі, якія перажылі вайну. Тады ён быў лепшым ласункам.

Давайце зараз зойдзем у хлебны магазін. Адразу кідаюцца ў вочы паліцы, на якіх раскладзены хлеб розных гатункаў. Выбірай на свой густ! Вось і выбіраюць: мацаюць рукамі кожную буханку, шукаючы найсвяжэйшы.

...Назаўсёды ўрэзаўся ў памяць выпадак, які назіраў у адным з райцэнтраў вобласці. Чакаючы аўтобуса, маладая жанчына з хлопчыкам знайшлі сабе займальны занятак: крышылі толькі што куплены бохан хлеба і кармілі галубоў. Добра, што яны любяць птушак. Але ж чаму гэтая любоў праяўляецца праз абыякавасць да хлеба?

Яшчэ адзін выпадак. Тлусташчокі малы надкусіў свежы баранак і кінуў яго на абочыну. Маці, якая ішла побач, замест таго, каб паўшчуваць сына, толькі заўважыла: «Смецце трэба ў скрынку кідаць». Што гэта? Няведанне цаны хлеба, непавага да працы людзей ці адсутнасць элементарнай культуры? Думаю, і тое, і другое. Між іншым, усё пачынаецца з дзяцінства.

Не магу ўтрымацца, каб не расказаць яшчэ пра адзін выпадак у процілегласць папярэднім. Пажылая жанчына, мая суседка, даганяла машыну, каб толькі перадаць сыну-прызыўніку кавалак хлеба, нібы свайго роду матчына благаслаўленне перад далёкай дарогай.

Сэрца баліць, калі бачыш, як з абыякавасцю выкідваюць хлеб у смеццеправод у інтэрнаце № 2. Пытаюся ў аднаго са студэнтаў.

— Чаму так робіш?

— А куды ж яго дзяваць?

— А хіба ў інтэрнаце няма спецыяльных кантэйнераў для чэрствага хлеба?

— Ды дзе там. Абяцалі, але...

Сапраўды, пра тое, што ў інтэрнаце няма спецыяльнага месца для чэрствага хлеба, газета «Беларускі універсітэт» ужо пісала (крытычны матэрыял «Парсюкі ў бытоўцы» ад 25 снежня 1986 года). У гэтым выступленні прыводзіліся наступныя лічбы: за месяц каля 100 кілаграмаў хлеба вывозіцца на звалку. А за год? А колькі такіх інтэрнатаў ва універсітэце? Газета выступіла з вострым сігналам. Але вывадаў зроблена не было. Дырэкцыя студгарадка чамусьці не хвалюецца за вырашэнне гэтай наспеўшай даўно праблемы. Хлеб як выкідвалі, так і выкідваюць па сённяшні дзень.

Дык давайце ж разам выхоўваць у людзях, асабліва ў моладзі, паважлівыя, беражлівыя адносіны да хлеба, вучыць іх любіць працу, абуджаць пачуццё сапраўднага гаспадара роднай зямлі. Каб нават чэрствы кавалак хлеба прыносіў карысць чалавеку, каб не зачарсцвела яго сэрца.

А. МІХАЛЕВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

У час вытворчай практыкі студэнты набываюць прафесійныя якасці, бліжэй і глыбей знаёмяцца са сваёй будучай спецыяльнасцю. Але каб яна давала больш значныя рэзультаты неабходна зацікаўленасць і студэнтаў, і выкладчыкаў, і кіраўнікоў на месцах.

Наш няштатны карэспандэнт, студэнтка факультэта журналістыкі М. НАРЭЙКА сустрэлася з выкладчыкам кафедры крымінальнага працэсу, адказным за практыку на юрыдычным факультэце Усеваладам Пятровічам Лагойскім. Іх гутарка была прысвечана вытворчай практыцы студэнтаў-юрыстаў.

Прыходзіць змястоўная работа

— ЯК БЫ БАНАЛЬНА гэта ні гучала,— гаворыць У. П. Лагойскі,— але я лічу, што галоўны сэнс практыкі заключаецца ў набыцці студэнтамі спецыяльных уменняў і навыкаў работы ў якасці юрысконсультаў, а таксама ў пракуратуры і судзе. Калі ўчарашнія абітурыенты прыходзяць да нас, то яны думаюць, што будуць працаваць юрыстамі. А калі заканчваюць факультэт, ужо цвёрда ведаюць, што будуць ці адвакатамі, ці следчымі, ці юрысконсультамі.

Зразумела, такая ўпэўненасць прыходзіць да студэнтаў у ходзе вытворчага працэсу, якому на факультэце надаецца вялікая ўвага. Так, год назад адбылася міжведамасная нарада выкладчыкаў юрыдычнага факультэта БДУ, практычных работнікаў Пракуратуры БССР і Міністэрства юстыцыі БССР, на якой вялася размова аб павышэнні якасці арганізацыі і правядзення практыкі студэнтаў-юрыстаў. Цяпер уся работа на факультэце накіравана на выкананне рашэнняў нарады і рэкамендацый, адрасаваных дэканату.

І вынікі не прымусілі чакаць. Разам з Пракуратурай БССР стварылі на факультэце лабараторыю пракурорскай і следчай дзейнасці, факультатыў па машынапісу і судовай фатаграфіі. Дзякуючы гэтаму студэнты могуць карыстацца пішучымі машынкамі і займацца фатаграфіяй у добра абсталяванай лабараторыі.

Выконваючы рашэнні нарады, а таксама з мэтай вывучэння канкрэтных юрыдычных органаў на факультэце выбраны пазаштатныя памочнікі пракуратуры. Іх 30 чалавек, у асноўным другакурснікі. У вольны ад вучобы час студэнты-юрысты выконваюць розныя даручэнні і заданні. Іх задавальняе такая форма: і цікава, і, галоўнае, карысна. Пракуроры, зразумела, таксама рады такім памочнікам.

Практыку студэнты II і III курсаў праходзяць толькі на тэрыторыі рэспублікі. У другакурснікаў яна тры тыдні. Першыя два яны знаёмяцца з работай юрыдычнага аддзела РАПА, трэці — юрыдычнага аддзела выканкома. Практыка ж трэцякурснікаў больш адказная: два тыдні ў судзе і два — у пракуратуры. Каб студэнты добра ведалі, што ім рабіць у органах пракуратуры, яны прымаюць удзел у рабоце трохдзённага семінара, які праходзіць кожны год у пракуратуры рэспублікі.

Цікава, а як самі студэнты ставяцца да такога парадку правядзення практыкі? Размаўляю з трэцякурсніцамі Наталляй Лапуцкай, Інай Гуцуляк, Эльвірай Паўлоўскай, Наташай Салагуб. Яны, як ні дзіўна, амаль аднолькавага меркавання наконт сваёй першай практыкі: нецікава, несур'ёзныя адносіны з боку выкладчыкаў на месцах. А Наташа Лапуцкая, якая чакала ад практыкі большага, прама заявіла: «Па праўдзе кажучы, я прыйшла да высновы, што юрысконсультам можна працаваць без юрыдычнай адукацыі». Такі пункт гледжання выклікаў у студэнтаў спрэчкі. У рэшце рэшт усе пагадзіліся з меркаваннем Іны Гуцуляк: «Улічваючы ўсе нюансы, трэба адзначыць, што практыка неабходна, а юрыдычныя аддзелы райвыканкомаў і РАПА займаюць важнае месца ў радзе юрыдычных органаў».

Студэнты IV курса Канстанцін Кніга, Валерыя Тарасава, Іна Патапава, Валерый Міцкевіч і Іна Хоміч узрушана расказвалі пра сваю практыку.

Валерыя Тарасава шмат карыснага для сябе пачарпнула ў час работы ў пракуратуры Бабруйска. Яна прысутнічала на допытах абвінавачваемых, на апазнанні ў якасці панятой, вяла гутаркі з людзьмі, якія з'яўляюцца хранічнымі алкаголікамі.

Іна Хоміч праходзіла практыку ў Кастрычніцкім раёне г. Мінска. Шмат добрых слоў адрасавала яна свайму кіраўніку, памочніку пракурора па агульнаму нагляду Э. Ф. Ханенку.

Канстанціну Кнізе і Валерыю Міцкевічу практыка спадабалася тым, што, у параўнанні з мінулым годам, да іх ставіліся больш сур'ёзна, больш. аказвалі даверу. Ды і аб'ём і змест практыкі не параўнаць.

Чаму ўсе субяседнікі імкнуліся правесці паралель паміж практыкай II і III курсаў? Адказаць канкрэтна ніхто не змог, але згадзіліся, што без папярэдняй практыкі не адбылася б і сёлетняя. Бо яно звычайна так і атрымліваецца: пасля першай маленькай справы прыходзіць цікавая, змястоўная работа.

ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА: ГРАНІ ПЕРАБУДОВЫ

«Слова за завочнікам»

ТЭЛЕФОН не змаўкаў. Метадысты завочнага факультэта ўжо стаміліся адказваць на аднолькавыя пытанні, што чуліся на тым канцы проваду: «Чаму ў мяне аплачваемы водпуск на сесію? Ці няма тут памылкі?».

Гэта вельмі турбавала знаёмых і сяброў, што вучацца разам са мной на завочным, і былі яны перапалоханы не на жарт. Усім ім, без выключэння, напярэдадні Новага года прыйшлі на дом даведкі-вызавы з аплачваемым водпускам на перыяд сесіі. Такая папера пажадана, вядома, заўсёды, але, на жаль, не ўсе завочнікі і не заўсёды маглі ёю пахваліцца. А тут раптоўна — усім без выключэння! Трывогу аднакурснікаў можна было зразумець і так: а ці не выклікаюць новыя перамены на іх факультэце яшчэ большыя цяжкасці ў жыцці завочніка? За адказам я звярнулася да дэкана завочнага факультэта універсітэта Генадзія Васільевіча МАЦВЕЕВА.

— Няхай завочнікі лічаць даны вызаў на сесію своеасаблівым навагоднім падарункам. І не турбуюцца. Справа ў тым, што ў сістэме завочнай формы навучання ўрэшце пачалі адбывацца перамены. Мне хочацца быць упэўненым, што перамены да лепшага: як для нас, тых, хто кіруе вучэбным працэсам на факультэце, для выкладчыкаў, якія вядуць прадметы і курсы на завочным, так і для саміх студэнтаў.

Пры падрыхтоўцы новых мер, закліканых значна палепшыць і ўдасканаліць сістэму завочнага навучання ва універсітэце, мы кіраваліся Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па карэннаму паляпшэнню якасці падрыхтоўкі і выкарыстання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй ў народнай гаспадарцы» і загадам МінВНУ СССР «Аб першачарговых мерах па перабудове сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці».

Не сакрэт, што студэнту-завочніку ў перыяд сесіі прыходзіцца намнога цяжэй, чым студэнту стацыянара. Завочнік працуе, нярэдка мае сям'ю і ад сесіі да сесіі ён жыве далёка не весела, таму што павінен самастойна вучыцца і рыхтавацца да залікаў і экзаменаў. Гэта цяжка. Сесія завочніка да таго ж настолькі сканцэнтраваная, што і не дзіўна, калі студэнт маральна проста не спраўляецца з нагрузкамі. Таму, каб паменшыць перагрузку студэнтаў у сесію і пашырыць дапамогу ў самастойнай рабоце, павялічана колькасць дзён завочніка — да 6—7 у семестр. На кожнай кафедры ў такія дні будуць арганізаваны дзяжурствы. Гэта азначае, калі завочнік падрыхтаваў які-небудзь прадмет, прынамсі, любы з тых, які яму патрэбна здаваць у сесію, ён можа смела ў «свой дзень» адчыняць дзверы адпаведнай кафедры — яго там чакаюць.

Адмяняюцца і завочныя залікі кантрольных. Цяпер студэнту, каб атрымаць залік па кантрольнай рабоце, якая нярэдка з'яўляецца творча перапрацаваным плагіятам, трэба будзе прад'яўляць кантрольную асабіста выкладчыку, пераважна ў перыяд паміж сесіямі. Завочнік атрымае такім чынам і магчымасць кансультавацца са сваімі выкладчыкамі значна часцей.

— А што рабіць тым, хто жыве далёка ад Мінска?

— Таксама ездзіць. Калі студэнт мае «хвост», ён гатовы ездзіць хоць 10 разоў, забываючыся на такія папулярныя прычыны, як хвароба ці перагрузка на рабоце. Да таго ж, думаецца, у студэнта павысіцца адказнасць за выконваемыя кантрольныя работы.

— А ці цяжка будзе ў новых умовах атрымаць аплачваемы вызаў?

— Яго будуць атрымоўваць усе, акрамя тых, хто мае акадэмічную запазычанасць за папярэдні курс. Прынамсі, асаблівасць яго ў тым, што ён выдаецца на год наперад.

— Вось як добра!

— Так. Але будуць павышацца і патрабаванні. Напрыклад, да студэнтаў іншых форм навучання і раней адлічаных пры іх вяртанні ці пераводзе для вучобы на завочны факультэт. Каб перавесціся на яго, ім для гэтага неабходна будзе працаваць па адпаведнай спецыяльнасці. Дыпломнік, калі ён не будзе з'яўляцца на кансультацыі, атрымае аб гэтым паведамленне на работу — з мэтай адмены яму аплачваемага водпуску.

— А да выкладчыкаў павысяцца патрабаванні?

— Зразумела. Да работы з завочнікамі высококваліфікаваныя выкладчыкі будуць прыцягвацца значна болей. Да таго ж штогод мяркуем праводзіць анкетаванне студэнтаў, каб даведацца іх думку наконт якасці выкладання таго ці іншага выкладчыка. З вынікамі анкетавання будуць знаёміцца рэктарат, партком, загадчыкі кафедраў. Першае такое анкетаванне ўжо адбылося на I курсе аддзялення геаграфіі.

— Ці аблегчыцца як-небудзь становішча завочнікаў з раскватараваннем? Вядома, на гасцініцу трэба шмат грошай, а добрыя знаёмыя ці блізкія ў горадзе не заўсёды ёсць. Мне, напрыклад, вядомы выпадкі, калі завочнік з-за адсутнасці койка-месца начаваў на вакзале...

— З пражываннем іншагароднім завочнікам у час сесій, здачы дзяржэкзаменаў і выканання дыпломных работ імкнёмся дапамагчы, бо добра разумеем незайздроснае становішча, у якім чалавек аказваецца ў чужым горадзе, калі яму няма дзе нават пераначаваць, не тое што рыхтавацца да залікаў. З гэтай нагоды будзе створаны рэзерв у колькасці 200 месц у інтэрнатах. Праўда, у час надыходзячай зімовай сесіі складанасці яшчэ будуць. Такі рэзерв мы пакуль не паспелі падрыхтаваць з-за таго, што загад МінВНУ быў прыняты пасля пачатку навучальнага года. Але пастараемся зрабіць для нашых студэнтаў усё магчымае, каб стварыць ім добрыя ўмовы для паспяховай вучобы. Цяпер слова за самімі завочнікамі, якое яны скажуць у час здачы зімовай сесіі.

Інтэрв'ю правяла
А. ВІХРОВА.

БЫТ ЦІ НЕ БЫТ?

Не так даўно ў БДУ імя У. І. Леніна прайшоў пленум прафсаюзнага камітэта студэнтаў, на якім ішла размова аб арганізацыі грамадскага харчавання ва універсітэце. Трэба адзначыць, што яно не задавальняе студэнтаў.

Сталовая на «дыеце»

НА ТЭРЫТОРЫІ БДУ знаходзяцца 9 сталовых, 7 буфетаў, малочны бар. Агульная колькасць пасадачных месц — 1198, а вось дыетычных пунктаў няма. Большасць сталовых размешчаны ў прыстасаваных памяшканнях, матэрыяльная база іх дрэнная, патрабуе рамонту ці наогул замены.

Патрэбна адзначыць, што ўмовы работы ў сталовых пакідаюць жадаць лепшага. У прыватнасці, зімой тут скразнякі, работнікі часта хварэюць. З-за гэтага і нежаданне працаваць лепш, і недахоп кадраў.

У маі мінулага года праводзілася апытанне грамадскай думкі студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта з мэтай выявіць вузкія месцы ў арганізацыі і якасці харчавання ў інтэрнатах і вучэбных карпусах БДУ. Апытана 1200 чалавек. У анкеце ставіліся пытанні аб якасці ежы, графіку работы прадпрыемстваў, узроўні абслугоўвання.

Агульным для ўсіх сталовых недахопам з'яўляецца якасць ежы, асартымент страў і абслугоўванне. Згадзіцеся, меню тут нельга назваць разнастайным, стравы часта паўтараюцца, асабліва халодныя закускі, гарніры і трэція. А бывае і такое, што ў меню названа адно, а ў продажы — зусім іншае. Ва ўсіх сталовых вельмі рэдка прадаюцца салаты з морквы, буракоў, капусты, якія каштуюць 3—5 капеек. Затое колькі хочаш камбінаваных салатаў, якія каштуюць значна даражэй. Напрыклад, па 27 капеек і больш. Колькі ж тады будзе каштаваць увесь абед? Мы не павінны забываць, што нашы кліенты — студэнты, у якіх бюджэт абмежаваны. І плаціць рубель, а то і больш за абед — для іх многа, ды яшчэ калі і якасць страў нізкая. Калі правяраеш бракеражны журнал, то ўсюды подпіс: «Якасць стравы добрая». Але чаму, калі пачынаеш есці, прападае апетыт? Напэўна, таму, што не захоўваецца тэхналогія прыгатавання. На маю думку, у гэтым галоўная прычына няякаснай ежы.

Хочацца спыніцца і на трэціх стравах. Чай — надзвычай папулярны напітак сярод студэнтаў, бо ён самы танны. Тут, у асноўным, адно патрабаванне: каб быў гарачы. Але ці выконваецца гэта не такая ўжо і складаная ўмова? Безумоўна, не. Звычайна на раздачы стаіць крыху цёплая брудна-жоўтага колеру з затхлым пахам вада. А што ж узяць замест чаю? Можа сок? Тут таксама выбар невялікі. Часцей вам прапануюць яблычны ці бярозавы. Адкуль жа тады студэнтам браць вітаміны?

А зараз давайце звернемся да рэзультатаў анкетавання. Вось як ацэньваюць студэнты асартымент страў, якія ім прапануюць: у буфетах філфака ён не задавальняе 87,2 працэнта наведвальнікаў, інтэрната № 4 — 41, сталовай галоўнага корпуса — 30,8, хімічнага — 32, інтэрната № 1 — 52, СКТБ — 57, а ў буфеце біяфака — 75 працэнтаў. Не лепшыя даныя і па якасці страў.

Вузкае месца — санітарны стан сталовых. Асабліва шмат нараканняў на дрэннае мыццё посуду. Талеркі і сталовыя прыборы выслізгваюць з рук. Работнікі кропак грамадскага харчавання тлумачаць гэта недахопам мыючых сродкаў. Але чаму з-за гэтага павінны пакутаваць наведвальнікі?

Многіх апытаных не задавальняе рэжым работы сталовых і буфетаў, асабліва гэта датычыць сталовай СКТБ з доследнай вытворчасцю. Студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі звярнуліся з просьбай перагледзець графік работы сталовай. Пісьмо накіравана ў Кастрычніцкі трэст сталовых і рэстаранаў. Спадзяёмся, што там вырашаць пытанне на карысць наведвальнікаў.

Пры праверцы сталовых і буфетаў былі выяўлены парушэнні правілаў захавання прадуктаў, а таксама іх рэалізацыі. Вось прыклад. 10 снежня была праведзена праверка буфета філалагічнага корпуса. Прывяду выпіску з акта: «У халадзільніку — 3 кг 350 г сасісак, тэрмін захавання якіх даўно мінуў, ахаладжальная вітрына не працуе, у продажы няма кексаў, якія ёсць у падсобным памяшканні, і г. д.».

Шмат недахопаў выяўлена і ў пункце грамадскага харчавання інтэрната № 4. Наведвальнікі звярнулі нашу ўвагу на высокія цэны (буфет працуе ад рэстарана «Нямігa» і прадукты ідуць са значнай надбаўкай).

Асабліва многа нараканняў у студэнтаў на работу сталовых галоўнага і хімічнага карпусоў. Тут у нейкай ступені адбіваецца і тое, што план, які ім даводзіцца выканаць цяжка. Вельмі хочацца верыць, што з цягам часу ўсе недахопы будуць выпраўлены і ў сталовую прыемна будзе зайсці: посуд вымыты, сталы чыстыя, а на іх — кветкі... Вам прапануюць прыемнага апетыту. І будзе ён сапраўды прыемны.

Т. МАРОЗАВА,
старшыня камісіі грамадскага кантролю за пунктамі харчавання.

РАХУНАК № 702

ПАМЯЦЬ АБАВЯЗВАЕ

У АПОШНІ час вядуцца рэстаўрацыйныя работы па аднаўленню помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў горадзе Мінску. Некаторыя з іх былі разбураны часам, некаторыя — людзьмі ў першай палове XX стагоддзя. На іх развалінах многія гады рос бур'ян. Такі ж лёс напаткаў і помнік культуры эпохі феадалізму — царкву Святога духу, якая была разбурана ў 1937 годзе. У 70-х гадах на яе фундаменце пабудаваны помнік «сучаснай культуры» — піўны бар «Ясень».

Некаторыя задаюць пытанне: «А навошта нам аднаўляць тое, што звязана з рэлігіяй?» Па-першае, рэлігія многія стагоддзі была непарыўна звязана з развіццём культуры народа, па-другое, гэта перш за ўсё памяць пра тых зодчых, рукамі якіх ствараліся сапраўдныя творы мастацтва. Ці скажуць нам нашы нашчадкі дзякуй за тое, што мы ім у спадчыну пакінулі толькі шэра-бетонныя і шкляныя збудаванні? Па-трэцяе, напрыклад, калі адновяць па чарцяжах (а яны ёсць) Святадухоўскую царкву, то мы набудзем такім чынам канцэртную залу для арганнай музыкі. Да слова, у многіх гарадах Прыбалтыкі, Чэхаславакіі, Венгрыі шырока выкарыстоўваюцца старыя будынкі для правядзення культурных мерапрыемстваў.

У мэтах аказання дапамогі па рэстаўрацыі і аднаўленню помнікаў культуры студэнты другой групы III курса гістарычнага факультэта сабралі сродкі і заклікаюць усіх студэнтаў і выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта падтрымаць ініцыятыву як матэрыяльна, так і маральна.

Нумар рахунку 702 (з указаннем, для якога аб'екта збіраюцца сродкі).

І. ГУПАЛОВІЧ,
камсорг II групы
III курса гістарычнага
факультэта.

НЕ БЫВАЮЦЬ БЕЗ РАБОТЫ

нават у час экзаменацыйнай сесіі і канікулаў супрацоўнікі аддзела масавай работы бібліятэкі. Загляніце сюды, і вы пераканаецеся ў гэтым самі. Вам патрэбна дапамога ў правядзенні тэматычнага вечара? Калі ласка, супрацоўнікі аддзела дадуць канкрэтныя парады, прапануюць распрацоўкі. Не ведаеце, як цікавей зрабіць агляд літаратуры? Звярніцеся сюды, і вы атрымаеце патрэбную дапамогу.

Але не толькі гэтым займаюцца ў аддзеле масавай работы. Супрацоўнікі яго самі рыхтуюць і праводзяць шмат мерапрыемстваў. Назавём толькі некаторыя, што прайшлі ў апошні час: агляды «Выратаваныя шэдэўры», «Капітан далёкага плавання», «В. Шукшын», вечары «Высоцкі — паэт, артыст, чалавек», «Лірыка кахання Маякоўскага» і іншыя, а таксама дыспуты, тэматыка якіх самая разнастайная.

З. МІХНЕВІЧ.

З КЛОПАТАМ АБ ПРЫРОДЗЕ

Падзялі мой боль

У КАНЦЫ мінулага года пад Масквой на базе МФТІ адбылася Усесаюзная канферэнцыя руху дружын па ахове прыроды (ДАП). Мэта яе — стварэнне каардынацыйна-метадычнага савета (КМС) руху і прыняцце прыкладнага палажэння аб студэнцкай дружыне па ахове прыроды. У састаў КМС увайшлі прадстаўнікі дружын усіх раёнаў Савецкага Саюза і дружын-каардынатараў такіх міждружынных праграм, як «Выстрал», «Елка», «Запаведнікі», «Школа», «Рэкрэацыя», «Барацьба з жорсткасцю» і іншыя.

Каля 350 чалавек прадстаўлялі 108 дружын па ахове прыроды. Прыехалі нават дэлегаты з Іркуцка, Якуціі. Былі студэнты з самых розных ВНУ: універсітэтаў, сельскагаспадарчых, тэхналагічных, хіміка-тэхналагічных, фізіка-тэхнічных, педагагічных, авіяцыйных і іншых інстытутаў. Толькі з Украіны прыехала каля 30 дэлегацый. Беларусь, на жаль, прадстаўлялі толькі БТІ, БІМСГ, біяфак і геафак БДУ і Гомельскі універсітэт — усяго 8 чалавек.

Па ўсёй краіне рух набывае шырокі размах. Яго ўдзельнікі збіраюць подпісы, пішуць пісьмы ў ЦК КПСС, міністэрствы, праводзяць дэманстрацыі. Мэта іх — ахова прыроды. З радасцю даведаліся мы на канферэнцыі аб спыненні будаўніцтва Даўгаўпілскай ГЭС.

Перад дэлегатамі выступілі член-карэспандэнт АН СССР А. В. Яблакаў і прафесар Ціхаміраў, якія гаварылі, што ўдзельнікам руху патрэбна ставіць больш глабальныя задачы, чым барацьба з асобнымі грамадзянамі, якія парушаюць законы. І адна з іх — выхаванне ў людзей правільных адносін да прыроды. Выкладанне экалогіі, аховы прыроды ў ВНУ не дае належнага эфекту.

На біяфаку, асабліва ў апошнія гады, паявілася больш магчымасцей працаваць у гэтым напрамку ў школах. Праграма «Школа» уключае акрамя лекцый, гутарак падрыхтоўку навучэнцамі мініплакатаў, якія заклікаюць зберагаць каштоўныя кветкі, рэдкіх звяроў, птушак, замяняць навагоднія ёлкі ў нашых кватэрах зімовымі букетамі.

Цікавая і праграма «Запаведнікі». Члены дружын фарміруюць атрады (ад 3 да 20 чалавек), якія афармляюцца на работу ў запаведнікі на любы тэрмін з красавіка да кастрычніка. Дарэчы, адрасы запаведнікаў, што маюць патрэбу ў рабочай сіле, можна даведацца ў Казанскім універсітэце, які каардынуе праграму. А выступаўшыя на канферэнцыі работнікі многіх запаведнікаў запрашалі да сябе на пастаянную работу.

Згуртаванасць удзельнікаў руху асабліва выявілася на сустрэчы з начальнікамі аддзелаў Мінлясгаса, Мінводгаса, Аграпрома СССР. Пасля прэс-канферэнцыі стала зразумела, што многія міністэрствы больш хвалюе план, расходаванне выдзеленых сродкаў, чым клопат аб навакольным асяроддзі і здароўі людзей.

Вялікія надзеі звязваем мы зараз з фарміраваннем у бліжэйшы час Дзяржкамітэта СССР па ахове прыроды (такія камітэты існуюць зараз у БССР і УССР, толькі вялікай карысці яны не прыносяць).

На думку ўдзельнікаў канферэнцыі, самай уплывовай сілай, якая можа нешта зрабіць у справе аховы прыроды, з'яўляецца грамадская думка. Іменна дзякуючы ёй у Куйбышаве рыбаловы дабіліся змянення заканадаўства, якое дазваляла прамысловую лоўлю рыбы ў час нерасту.

Дык давайце ж не будзем абыякава глядзець на кучы смецця ў лесе, на рознакаляровыя фантаны з завадскіх труб, чорныя клубы дыму. Вецер толькі да часу дзьме не нам у твар!

А. ВІНЧЭЎСКІ,
студэнт біялагічнага
факультэта, член
штаба ДАП.

А Ў НАС! А Ў ВАС?

БЕЛАРУСКІЯ пісьменнікі і паэты — частыя і жаданыя госці на філалагічным факультэце. З гэтых сустрэч будучыя мовазнаўцы і літаратары чэрпаюць сілы і натхненне для вучобы і работы, даведваюцца шмат цікавага і карыснага.

І кожная сустрэча — непаўторная, незабыўная. Такой была і апошняя, калі ў госці да філолагаў прыйшоў народны пісьменнік БССР Янка Брыль.

— Мне заўсёды цікава сустракацца са студэнтамі вашага факультэта,— заўважыў Я. Брыль,— таму што слухаюць цябе людзі зацікаўленыя. З такімі субяседнікамі прыемна гутарыць, адказваць на пытанні: праблемныя, глыбокія.

Пісьменнік расказаў прысутным аб рабоце над творам, пазнаёміў студэнтаў і выкладчыкаў з планамі на будучае.

Цёпла і радушна сустрэў госця фальклорны студэнцкі калектыў, які паказаў міні-сцэнкі з жыцця герояў твораў Янкі Брыля.

В. НАВУМЕНКА,
студэнт філалагічнага факультэта.

Гэтыя здымкі зроблены аўтарам у час сустрэчы.

ПОШУКІ, ГІПОТЭЗЫ, МЕРКАВАННІ

Беражы свой ...мозг!

ПАВОЛЬНА, без асаблівых узрушэнняў і стрэсаў ход жыцця XIX стагоддзя змяніўся неймаверным ростам сродкаў інфармацыі, што разам з НТР прывяло да інфармацыйнага выбуху.

Сучасны чалавек вельмі добра адчувае, у якім інфармацыйным палоне ён знаходзіцца. Але адказы на пытанні, што такое інфармацыя, як яна ўплывае на чалавека, якім чынам ён павінен карыстацца ёю, каб не нашкодзіць інфармацыйнымі перагрузкамі — яшчэ не да канца зразумелыя навуцы.

Звычайна інфармацыю ўяўляюць як нейкія паведамленні, выкладзеныя на паперы ці назапашаныя і прапануемыя чытачу (гледачу), а яго справа, маўляў, рашаць: прымаць такую інфармацыю да свядомасці ці ігнараваць яе.

Але паняцце інфармацыі значна шырэй і глыбей, бо яна заключаецца ў матэрыяльным носьбіце — сігнале. І таму інфармацыя—гэта не прапаганда, а матэрыяльнае, энергетычнае ўздзеянне на мозг. Пры іншым падыходзе да гэтага пытання мы абавязкова з паслядоўнага матэрыялістычнага пункту гледжання спаўзём у бездань ідэалізму.

Мозг валодае так званай функцыянальнай асіметрыяй вялікіх паўшар'яў: левае паўшар'е кантралюе лінгвістычныя і матэматычныя функцыі, а правае ўдзельнічае ў забеспячэнні вышэйшых зрокава-прасторавых функцый і ініцыятыўна творчых паводзін.

Нармальнае развіццё псіхікі чалавека патрабуе збалансаванай падачы інфармацыі і для левага, і для правага паўшар'яў. У процілеглым выпадку нармальнае развіццё чалавека немагчыма.

Прымаючы да ўвагі даную гіпотэзу, ці можна спакойна назіраць за грубейшымі парушэннямі інфармацыйнага балансу ў школах і ВНУ? Засілле фармальна-лагічных і матэматычных дысцыплін і амаль поўная адсутнасць прадметаў эстэтычнага курса шкодзіць нашым дзецям. Школа і ВНУ, ідэалам якіх з'яўляецца маўклівая, пакорлівая, залежная ад выкладчыка аўдыторыя, не могуць спраўляцца з задачай гарманічнага і ўсебаковага развіцця маладога пакалення.

Што ж можна змяніць у сістэме нашай адукацыі? Галоўнае — паменшыць колькасць лекцый да 20—22 гадзін у тыдзень, скараціць курс «левапаўшарных» навук і шырока ўвесці эстэтычныя прадметы. Трэба зрабіць вучэбны працэс больш разнастайным, напрыклад, гэтаму магло б садзейнічаць шырокае прымяненне наглядных дапаможнікаў, у прыватнасці вучэбных мультыплікацыйных фільмаў, вельмі карысным было б увядзенне ў тэхнічных ВНУ эстэтычных спецфакультатываў (адзін з якіх быў бы абавязковым).

Ні для каго не сакрэт, што ідэалагічная барацьба — гэта барацьба за розумы. Кантроль Злучанымі Штатамі Амерыкі над інфармацыяй не толькі ў краінах трэцяга свету, але і ў Заходняй Еўропе — гэта не проста пагроза бездухоўнасці, гэта матэрыяльнае разбурэнне, напэўна, галоўнага багацця любой краіны — людзей, якія здольны творча мысліць. Адзіная абарона ад гэтай пагрозы — выхаванне гарманічна развітых людзей, што немагчыма без карэннай перабудовы сістэмы адукацыі.

Чалавек жа, які правучыўся дзесяць гадоў у «звычайнай» школе і пяць гадоў у «звычайнай» ВНУ — амаль патэнцыяльная ахвяра ў інфармацыйнай барацьбе. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба — усеагульнае захапленне рок-музыкай ва ўзросце ад 10 да 25 гадоў, рост алкагалізму і наркаманіі ў апошнія гады, усё гэта мае пад сабой тую ж нейра-фізіялагічную аснову.

У дакументах партыі і ўрада неаднаразова ўказвалася, што нам, як паветра, патрэбны ініцыятыўныя, творчыя людзі — іменна яны галоўныя праваднікі перабудовы, іменна такіх людзей павінна выхоўваць сацыялістычнае грамадства. Ці магчыма выхаваць такіх людзей, пакідаючы без увагі матэрыяльную аснову творчасці і ініцыятывы — мозг? Нельга!

У. САФРОНАЎ,
студэнт гістарычнага
факультэта, аддзяленне
філасофіі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
14 студзеня 1988 г.
Зак. 1608.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.